***Набор № 1*** – карткі для адпрацоўкі ўмення правільна ўжываць раздзяляльны мяккі знак ці апостраф.

Прыклад карткі

| ***Правер:*** бязрыб’е, салаўі, Арсеньеў, з’яўляецца | ***Устаў замест кропак мяккі знак ці апостраф:*** бязрыб..е, салаў..і, Арсен..еў, з..яўляецца | **Набор № 1** ***Раздзяляльны мяккі знак пішацца*** пасля мяккіх зычных перад літарамі е, ё, ю, я, і, калі яны абазначаюць гукі [й’э], [й’о], [й’у], [й’а], [й’і]: *Марэсьеў, паштальён, Аркадзьеўна.* ***Апостраф пішацца*** пасля прыставак і ў сярэдзіне слоў пасля цвёрдых зычных перад е, ё, ю, я, і: *раз’езд, раз’юшаны, надвор’е, куп’ё, сям’я, Мар’і.* *Заўвага. Пасля «ў» апостраф не пішацца: здаро**ўе**, сала**ўё**м, аба**ўю**ць* |
|---|---|---|

***Набор № 2*** – карткі для адпрацоўкі правіла напісання літар «ў» і «у».

Прыклад карткі

| ***Правер:*** свята ўраджаю, акварыум, на Урале, саксаул | ***Устаў замест кропак літары «ў» ці «у»:*** свята ..раджаю, аквары..м, на ...рале, сакса..л | **Набор № 2** ***Літара «ў» пішацца*** пасля галосных:<br>1) у пачатку слоў: *свята **ў**раджаю*;<br>2) у сярэдзіне слоў: *во**ў**к, фа**ў**на, па**ў**за*;<br>3) у канцы слоў: *брата**ў**, кро**ў**, веда**ў***;<br>4) пасля двукосся і злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *кінатэатр «Радзіма» **ў**жо пачаў працу; паўночна-**ў**сходні.*<br>***Не пішацца:***<br>1) у пачатку і ў сярэдзіне слоў, калі на [у] падае націск: *каля **у**рны, даносіцца **у**ханне, а**у**л*;<br>2) на канцы запазычаных слоў, у тым ліку тых, якія заканчваюцца на **-ум, -ус**: *фрау, акварыум, радыус*;<br>3) у пачатку ўласных імён*: да **У**ладзі*;<br>4) пасля знакаў прыпынку |
|---|---|---|

***Набор № 3*** – карткі для адпрацоўкі правіла напісання літар «е» і «я».

Прыклад карткі

| ***Правер:*** | ***Устаў замест кропак літары «е» ці «я»:*** | **Набор № 3** |
|---|---|---|
| пасялковы, сеанс, Еўропа, Прыпяць | пас..лковы, с..анс, ..ўропа, Прып..ць | ***Літара «я» пішацца:***<br>1) у першым складзе перад націскам: *вецер – вятры, сем – сямнаццаць*;<br>2) у некаторых словах каранёвая літара я пішацца нязменна незалежна ад націску, напісанне такіх слоў неабходна запомніць: *вязаць, сувязь, повязь, святкаваць, месяц, Прыпяць, ядловец, тысяча, яскравы.*<br>***Літара «е» пішацца:***<br>1) у запазычаных словах пасля ***г, к, х***, у тым ліку і ва ўласных імёнах: *кефір, Герасім*;<br>2) у іншых запазычааных словах незалежна ад націску, у тым ліку і ў пачатку слова: *медаль, **Е**ўфрат*;<br>3) не ў першым складзе перад націскам: *вецярок, дзевятнаццаць, весела* |